# ШКОЛЬНЫЯ НОНКАНФАРМІСЦКІЯ СУПОЛКІ НА ТЭРЫТОРЫІ БССР У 1944–1954 гг.

**А. У. Кімбар**

*Мінскі гарадскі педагагічны каледж, вул. Макаёнка, 29, 220114, г.Мінск, Беларусь, andrejkimbar@gmail.com*

У артыкуле на аснове архіўных крыніц разглядаецца дзейнасць нонкарфамісцкіх арганізацый, якія ўзнікалі ў школах БССР з моманту вызвалення тэрыторыі краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў да сярэдзіны 1950-х гг. Вызначаюцца ўмоўныя плыні такіх аб'яднанняў, прычыны ўзнікнення і механізмы выкрыцця іх дзейнасці.

***Ключавыя словы:*** ЛКСМБ; камсамол; заходнія вобласці БССР; нонканфармізм; школа.

# ШКОЛЬНЫЕ НОНКОНФОРМИСТСКИЕ СООБЩЕСТВА НА ТЕРРИТОРИИ БССР В 1944–1954 гг.

**А. В. Кимбор**

*Минский городской педагогический колледж, ул. Макаёнка, 29, 220114, г. Минск, Беларусь, andrejkimbar@gmail.com*

В статье на основе архивных источников рассматривается деятельность нонконформистских организаций, возникших в школах БССР с момента освобождения страны от немецко-фашистских захватчиков до середины 1950-х гг. Определены условные течения таких объединений, причины возникновения и механизмы разоблачения их деятельности.

***Ключевые слова:*** ЛКСМБ; комсомол; западные районы БССР; нонконформизм; школа.

# SCHOOL NONCONFORMIST COMMUNITIES IN THE TERRITORY OF THE BSSR IN 1944–1954

**A. Kimbar**

*Minsk City Pedagogical College, Makayonka St., 29, 220114, Minsk, Belarus, andrejkimbar@gmail.com*

The article, based on archival sources, examines the activities of nonconformist organizations that emerged in schools of the BSSR from the moment of the country's territory liberation from Nazi occupation to the mid-1950s. It identifies the conditional trends of such groups, the reasons for their emergence, and the mechanisms for exposing their activities.

***Keywords:*** LKSMB; Komsomol; western regions of the BSSR; nonconformism; school.

Пасля вызвалення тэрыторыі Беларусі ад нямецка-фашысцкай акупацыі ўзнік шэраг нонканфармісцкіх арганізацый, якія ставілі перад сабой розныя мэты і задачы. Партыйныя і савецкія органы, а таксама члены грамадскіх аб'яднанняў выкрывалі дзейнасць такіх суполак.

У айчыннай гістарыяграфіі дадзенай праблематыцы прысвечаны шэраг работ. Так, у сваім дысертацыйным даследаванні і артыкулах І. А. Валахановіч [1] усебакова разглядае беларускае, польскае, літоўскае і ўкраінскае антысавецкае падполле. Даследчык аналізуе, у тым ліку, і дзейнасць падпольных груп і арганізацый, якія ўзнікалі ў беларускіх навучальных установах. У першаю чаргу ён разглядае дзейнасць Саюза патрыётаў Беларусі і арганізацыі «Чайка» [1, с. 41–46]. Н. А. Рыбак [2] у сваіх работах даследуе дзейнасць Арміі Краёвай і постакаўскіх фарміраванняў у Заходняй Беларусі ў 1944–1954 гг. С. А. Сіткевіч [3] у сваёй дысертацыі прааналізаваў гістарыяграфію праблемы дзейнасці польскага падполля на тэрыторыі Беларусі. Дадзеная праблематыка знайшла адлюстраванне і ў замежнай, асабліва польскай, гістарыяграфіі. Так, напрыклад, польскі гісторык беларускага паходжання Я. Шумскі [4] звяртаўся да дзейнасці антысавецкіх арганізацый у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе. Пад рэдакцыя А. І. Дзярновіча выйшаў шэраг даведнікаў па дадзенай тэматыцы [5; 6]. Пры гэтым неабходна адзначыць, што разглядаючы дзейнасць антысавецкіх арганізацый, даследчыкі амаль не закраналі пытанне існавання школьных суполак, якія ствараліся з рознымі мэтамі вучнямі і класіфікаваліся органамі бяспекі як антысавецкія ці падпольныя, але часта мелі непалітычныя мэты і задачы.

Мэта дадзенай работы — аналіз дзейнасці школьных нонканфармісцкіх суполак у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе.

У якасці крыніц выступаюць матэрыялы справаводства Цэнтральнага Камітэта Ленінскага камуністычнага саюза моладзі Беларусі (далей — ЛКСМБ), якія змешчаны ў фондзе 63п Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. Частка дакументаў упершыню ўводзіцца ў навуковы зварот.

Дзеячы ЛКСМБ прымалі актыўны ўдзел у выяўленні нонканфармісцкіх арганізацый на тэрыторыі БССР. У супрацоўніцтве з партыйнымі органамі і прадстаўнікамі аддзелаў народнай адукацыі старшыні гарадскіх, раённых і абласных камітэтаў ЛКСМБ, а таксама ўпаўнаважаныя ЦК прымалі ўдзел у праверках у школах, дзе ўзнікалі падпольныя суполкі. Разгледзім некалькі прыкладаў дзейнасці такіх нонканфармісцкіх арганізацый, якія былі выкрытыя камсамольскімі арганізацыямі.

У студзені 1949 г. у Белгрэсаўскай сярэдняй школе было выяўлена існаванне маладзёжнай арганізацыі «Маяк». Дадзеная суполка была створана ў снежні 1947 г., у яе ўваходзіў 21 вучань школы, сярод якіх было 12 камсамольцаў і чатыры піянеры. Для кіраўніцтва арганізацыяй быў створаны камітэт, у склад якога ўваходзілі камандор, казначэй і сакратар. Члены арганізацыі называліся камандасамі. Пры наяўнасці пяці членаў

ствараліся групы, на чале якіх быў групарг. У арганізацыі былі свой статут і сцяг. Пры ўступленні новымі членамі давалася клятва. Вяліся пратаколы сходаў, збіраліся членскія ўнёскі памерам два рублі на месяц.

Арганізатарам дадзенай суполкі быў Бахмат Іван 1932 г. нараджэння, які быў членам камсамола. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны яго бацька служыў у войску, а на момант выкрыцця дзейнасці «Маяка» быў дырэктарам лесазавода на БелГРЭСе.

І. Бахмат сцвярджаў, што арганізацыя была створана пад уплывам кніг Л. Касіля «Дорогие мои мальчики» і А. Гайдара «Тимур и его команда», а мэтай было аказанне дапамогі бедным, умацаванне сяброўства і таварыскасці паміж членамі арганізацыі [7, арк. 37].

Арганізацыя дзейнічала ў жорсткіх канспіратыўных умовах і некалькі разоў рэарганізоўвалася. Так, першапачаткова яна называлася «Сонечны прамень», пасля выхаду двух членаў была перайменаваная ў «Прамень перамогі» У студзені 1947 г. з суполкі выйшаў памочнік Бахмата Гасюта Анатоль, які абяцаў раскрыць арганізацыю, таму было прынята рашэнне пра змену назвы на «Маяк», а таксама пра змену формы членскага білета [7, арк. 38].

На сходзе 1 студзеня 1949 г. у будынку школы таемна адзначалася гадавіна дзейнасці арганізацыі. Былі прынятыя рашэнні актывізаваць дзейнасць арганізацыі і ўзмацніць прыём новых членаў. А І. Бахмат адзначыў: «За нами все пошли — комитет комсомола и учком» [7, арк. 39].

Падчас расследавання не было вызначана ці кіравалася арганізацыя кім-небудзь яшчэ, але па словах А. Гасюты І. Бахмат «намекал, что они не одиноки, что они имеют связь со старшими» [7, арк. 38].

У дакладной Віцебскага абкама ЛКСМБ аб дзейнасці маладзёжнай арганізацыі «Маяк» адзначаецца, што пасля выкрыцця дзейнасці арганізацыі на камсамольскім сходзе ўсе былыя яе члены прызналі сваю памылку і зразумелі, што маглі стаць знаходкай англа-амерыканскага шпіянажу [7, арк. 39–40].

У студзені 1950 г. у школе № 13 г. Віцебск у восьмым класе была арганізаваная суполка «Дружба». Яе арганізаваў вучань Абашын (сын ваеннага пракурора), які прыехаў з Суvoраўскага вучылішча г. Ташкент. Пасля выкрыцця арганізацыі ў школе 10 дзён працавала брыгада ў складзе сакратара гаркама партыі, сакратара абкама ЛКСМБ, сакратара гаркама ЛКСМБ і загадчыка гарана, якая прыйшла да высновы, што суполка ўзнікла ў выніку незадавальняючай работы камсамольскай арганізацыі класа і класнага кіраўніка [8, арк. 44].

13 лютага 1950 г. ад сакратара Маладзечанскага абкама ЛКСМБ Кляцкова ў ЦК ЛКСМБ было накіравана паведамленне, што органамі МДБ у Смаргонскай сярэдняй школе была раскрытая антысавецкая арганізацыя,

якая складалася з дзевяці вучняў старэйшых класаў. Яны набіралі на друкавальнай машынцы антысавецкія лістоўкі і расклейвалі іх у горадзе. У дадзенай арганізацыі знаходзіліся тры камсамольцы [8, арк. 12].

З 29 красавіка па 4 мая 1950 г. у Мінску ў школах № 11 і № 22 дзейнічала хуліганская група «Рыцарскі ордэн». Арганізатары групы збіраліся на валейбольнай пляцоўцы, дзе затрымлівалі вучняў і прапаноўвалі ім добраахвотна «пасвяціцца». Тых, хто адмаўляўся, распраналі да гала, білі рукамі і смяяліся. Гэта дзеянне называлася «пасвяшчэннем». У склад групоўкі ўваходзілі 16 вучняў з названых школ і рамеснага вучылішча № 24. На сходзе 4 мая кіраўніком («магістрам») групы быў абраны Валянцін Пятроў (вучань 7 класа школы № 22, камсамолец) [8, арк. 66–68].

У красавіку 1950 г. у Журавіцкай школе Гомельскай вобласці органамі МДБ была выкрыта арганізацыя, якая складалася з пяці вучняў 7 класа (тры з іх былі камсамольцамі). У дакладной запісцы першага сакратара ЦК ЛКСМБ П. М. Машэрава на імя сакратара ЦК КП(б)Б Ц. С. Сазонава адзначалася, што вучні былі завербаваныя амерыканскім агентам, жыхаром вёскі Новыя Журавічы Печкуровым, які ў перыяд Вялікай айчыннай вайны пражываў у Кёльне. Падчас вярбоўкі Печкуроў выкарыстоўваў тое, што бацькі двух вучняў у гады акупацыі супрацоўнічалі з немцамі [8, арк. 96].

У жніўні 1950 г. у Лідзе была створаная антысавецкая маладзёжная арганізацыя, якую выявіла Упраўленне аховы МДБ Брэст-Літоўскай чыгункі. Першапачаткова арганізацыяй кіраваў Ю. Фамін, які быў прызваны ў войска і служыў на момант выкрыцця ў Кранштадце. Сярод арыштаваных членаў арганізацыі было чатыры камсамольцы. У суполкі была свая палітычная праграма, у якую ўваходзілі наступныя пункты: ліквідацыя савецкай улады, ліквідацыя калгасаў і стварэнне фермерскіх гаспадарак, прыватызацыя, выхад Беларусі і Украіны з СССР і інш. Члены арганізацыі пад кіраўніцтвам І. Салдаценкава спрабавалі звязацца з польскім антысавецкім падполлем, супрацоўнічалі з украінскім. Былі здейсненыя спробы вярбоўкі навучэнцаў педвучылішча ў Лідзе, але безвынікова. У ходзе расследавання органамі МДБ у іншым раёне Гродзенскай вобласці была выкрытая яшчэ адна антысавецкая арганізацыя [9, арк. 61–63].

Неабходна адзначыць, што дзейнасць дадзенай арганізацыі знайшла адлюстраванне ў працах айчынных гісторыкаў. Так, у 1999 г. В. Шырокая надрукавала артыкул [10] пра гэтую арганізацыю, які быў раскрытыкаваны загадчыкам кафедры гісторыі славянскіх дзяржаў Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта В. М. Чарапіцам [11].

У сакавіку 1951 г. ад дырэктара Баярскай школы Васілішкаўскага раёна паступіла заява пра антысавецкае выступленне вучняў чацвёртага класа. Настаўнік рускай мовы І. М. Влагадзёраў правёў дыктант з намерам

палітычнай праверкі вучняў. Дыктант складаўся са сказаў «Я хочу быть пионером», «Быть пионером — почетное дело советского школьника», «Будь готов к борьбе за дело Ленина–Сталина» і г. д. Пяць вучняў напісалі гэтыя сказы з адмоўнай часціцай не («Я не хочу быть пионером», «Не быть пионером — почетное дело советского школьника», «Всегда не готов к борьбе за дело Ленина–Сталина», а чатыры вучні напісалі тэкст правільна, але закрэслілі сказы, дзе ішла размова пра партыю, камсамол і піянераў [9, арк. 35]. Вучні былі адлічаныя са школ, але пасля правядзення праверкі з боку райкама ЛКСМБ і райана вучні былі адноўленыя, а дзеянні настаўніка і адміністрацыі прызнаныя памылковымі. Таксама было прызнана, што бацькі вучняў, якія напісалі антысавецкія дыктанты знаходзіліся пад уплывам кулацкай, польска-нацыяналістычнай прапаганды. Так, бацька аднаго з вучняў М. Дзядовіч у канцы лютага нецвярозым прыйшоў да настаўніцы В. М. Строкавай і сказаў: «Вы не беспокойтесь, Вас никто не тронет, всем остальным большевикам осталось жить недолго, уже скоро здесь будут американцы и мы расправимся со всеми» [9, арк. 37].

У канцы красавіка 1951 г. органамі МДБ у Дзятлаўскай школе была раскрытая нацыяналістычная група, якая складалася з трох дзесяцікласнікаў і аднаго вучня вячэрняй школы. Усе яны былі камсамольцамі. Дзейнасць суполкі заключалася ў распаўсюджанні антысавецкай інфармацыі, а адзін з вучняў быў удзельнікам забойства дэпутата сельскага савета, якое было здзейснена ў студзені 1951 г. [9, арк. 45].

У красавіку 1952 г. у Асташковіцкай школе Віцебскай вобласці Анатолем Шэлепавым была створаная арганізацыя ОТД (Организация друзей-товарищей). У склад гэтай суполкі ўваходзіла 11 чалавек, у іх мелася свая пячатка, таксама існавалі членскія білеты, на якіх распісваліся сваёй крывёю. Мэты ў арганізацыі былі наступныя: добра і выдатна вучыцца, дапамагаць сем'ям тых, хто загінуў у гады вайны, кожны з членаў арганізацыі павінен быў удзельнічаць у калгаснай вытворчасці, а падчас летніх канікул выпрацаваць не менш за 100 працадзён. Членскія ўнёскі складаліся з 20 капеек. Пра існаванне арганізацыі было вядома Дуброўненскаму райкаму ЛКСМБ, але гэта не абмяркоўвалася на пасяджэннях бюро [12, арк. 46].

У студзені 1953 г. у 8 «А» класе Маладзечанскай школы № 2 была створаная падпольная група ЦКУРК (Цэнтральны камітэт уркачоў), якая складалася з пяці вучняў, два з якіх былі камсамольцамі. Усе ўдзельнікі характарызаваліся як недысцыплінаваныя. У суполцы былі свае пасады: старшыня таварыства, міністр МДБ, міністр выведкі, міністр фінансаў, сакратар. Унёскі складаліся з 15 капеек у дзень. У членскіх білетах адзначалі

выплату ўнёскаў. Усяго было сабрана 42 рублі. Палітычных мэтаў у арганізацыі выяўлена не было не было. Асноўная мэта дзейнасці — сабраць грошы для правядзення 1 Мая (для п'янкі).

Паралельна ў гэтым жа класе дзейнічала суполка «Ринговцы», якая складалася з чатырох вучняў, два з іх былі камсамольцамі. Арганізацыя распалася яшчэ да выкрыцця. Па словах удзельнікаў створаная як дзіцячая гульня. Што значыла назва суполкі ўдзельнікі не змаглі растлумачыць [12, арк. 31–32].

У красавіку 1954 г. інспектарам па рабоце сярод моладзі ЦК ЛКСМБ І. Якаўцавым падчас камандзіроўкі ў Старобінскім раёне была выкрыта арганізацыя СМВ (Саюз моладзі вёскі імя А. Матросава). Яна складалася з дзевяці членаў, якую стварыў школьнік-выдатнік Аляксей Макарэвіч. Ён сам напісаў статут арганізацыі і вырабіў членскія білеты. Задачай арганізацыі было выхаванне яе членаў такімі ж як гайдараўскі Цімур, як А. Матросаў і іншыя камсамольцы-героі. Члены суполкі паспелі правесці адзін сход, на якім А. Макарэвіч распавёў пра А. Матросава. Грошы, якія збіраліся ў якасці членскіх унёскаў, планавалася выкарыстоўваць для набыцця літаратуры пра камсамольцаў-герояў [13, арк. 3–6].

Аналізуючы дзейнасць і прычыны ўзнікнення школьных нонканфармісцкіх суполак можна вылучыць некалькі ўмоўных плыняў такіх арганізацый. Гэта суполкі, якія займаліся антысавецкай дзейнасцю пад уплывам іншых арганізацый ці людзей (журавіцкая, лідская, дзятлаўская арганізацыі), хуліганскія суполкі («Рыцарскі ордэн», ЦКУРК), і арганізацыі, якія ўзніклі пад уплывам літаратуры і афіцыйнай ідэалогіі, але арганізоўваліся як таемныя («Дружба», ОТД, СМВ). Заўважым, што школьныя нонканфармісцкія суполкі ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе ўзнікалі на тэрыторыі ўсёй БССР, але антысавецкі характар яны мелі пераважна на тэрыторыі заходніх абласцей рэспублікі.

Вывучэнне дзейнасці такіх суполак спрыяе больш глыбокаму разуменню сацыяльных і палітычных працэсаў, якія адбываліся ў савецкім грамадстве ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе, а таксама адлюстроўвае паўсядзённасць.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Валаханович И. А.* Антисоветское подполье на территории Беларуси в 1944–1953 гг.: организационная структура, программно-уставные положения и основные этапы деятельности: Дис. на соиск. учен. степ. канд. ист. наук: 07.00.02: 23.12.1999: 17.03.2000. Минск, 1999. 108 с.

2. *Рыбак Н. А.* Деятельность Армии Крайовой и постаковских формирований в Западной Беларуси в 1944–1954 гг.: автореф. дис. на соиск. учен. степ. канд. ист. наук: 07.00.02: 28.06.01. Минск, 2001. 19 с.

3. *Ситкевич С. А.* Деятельность польского подполья на территории Беларуси (1939–1954 гг.). Историография проблемы: автореф. дис. на соиск. учен. степ. канд. ист. наук: 07.00.09. Минск, 2002. 20 с.

4. *Шумскі Я.* Саветызацыя Заходняй Беларусі (1944–1953 гг.). Прапаганда і адукацыя на службе ідэалогіі. 2-е выд. Смаленск: Інбелкульт, 2014. 326 с.

5. Антысавецкія рухі ў Беларусі, 1944–1956: даведнік / А. Гардзіенка [і інш.]. Менск [Мінск] : АНГ, 1999. 190 с.

6. Нонканфармізм у Беларусі: 1953–1985. Даведнік. Т. 1 / Аўтар-укладальнік Алег Дзярновіч. Мінск: Athenaeum, 2004. 252 с.

7. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 63п. Воп. 42. Спр. 20.

8. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 31. Спр. 2.

9. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 31. Спр. 4.

10. *Шырокая В.* Дзейнасць падпольнай моладзевай антысавецкай арганізацыі ў г. Лідзе // Наша Слова. № 14. 7 красавіка 1999. С. 6. № 15. 14 красавіка 1999. С. 6.

11. *Черепица В. Н.* Лидская антисоветская молодежная организация (1951 г.): реконструкция мифа // Новая экономика: научно-теоретический, научно-практический, научно-методический журнал / учредитель: Общественная организация «Новая экономика». 2015. № 1. С. 345–362.

12. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 31. Спр. 8.

13. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 31. Спр. 10.